# Максім Багдановіч. Якім ён быў?..

**Часта ў біяграфічных творах альбо ўспамінах можна сустрэць падачу «мой…». І гэта датычыць не толькі агульных гісторый, але і характарыстык. Так, тое, што чалавек мае пэўныя знешнія рысы і індывідуальныя асаблівасці паводзін, яшчэ не азначае, што ва ўспрыняцці іншых людзей яны зафіксуюцца аб'ектыўна, хутчэй застануцца «іх» успамінамі.**

Больш за тое, пісьменнікі мінулага, якіх мы ўспрымаем праз творчасць і апісанні іншых асоб, фарміруюць у нас уласнае ўяўленне. Асабліва гэта датычыць персон рамантызаваных, напрыклад, такіх як Максім Багдановіч, што ў сваю чаргу таксама скрыўляе рэальнасць.

Але ж якім быў самы малады геній беларускай літаратуры? Як ён выглядаў, якімі рысамі быў адметны?

Здавалася, што можа быць прасцей?! Трэба проста паглядзець на фотаздымкі Максіма Адамавіча, пачытаць успаміны. Але справа ў тым, што з 18 да 25 гадоў захавалася літаральна чатыры фотавыявы паэта і сумніўны прыжыццёвы накід-партрэт, зроблены ў Крыме ў 1915 годзе, а мемуары бываюць вельмі супярэчлівымі.

Калі да Адама Ягоравіча Багдановіча звярнуліся з пытаннем, які здымкам праілюстраваць выданне лірыкі яго сына, той адказаў наступнае: «Вы просите совета, какой портрет моего сына М. Богдановича дать в сборник "Лирики". Я посоветовал бы не один дать, а два. Это дает более ясное представление о действительном облике поэта. Приложенный к 1-му тому Твораў взят с фотографической группы 1915 г., т. е. является наиболее зрелым снимком, но он вышел несколько более "крупнопланoвым", чем был на самом деле, и левый глаз вышел как-то косо. На другом групповом снимке поэт вышел недостаточно ясно, так что этот снимок может иметь только подсобное значение для воспроизведения живописного портрета. А два снимка в особицу тем хороши, что они являются не извлечением, а снимками, так сказать, с "натуры" и дают хорошее воспроизведение его облика, но на них он взят слишком юным. Но если давать один портрет, то тот, который приложен к 1-му тому Твораў. Попытка художника Волкова дать живописный портрет — неплохая попытка, но художник работал без оригинала».

А наступную цытату прыводзім з успамінаў Апалоніі Радкевіч (Савёнак), якая бачыла Максіма на творчых вечарах-«суботніках» у Мінску: «Ён быў зусім не падобны на тых фота, што мы знаходзім тут у нашых эміграцыйных выданнях».

Пэўныя адрозненні ў здымках, апрацаваных партрэтах і вобразе, які захаваўся ў яго памяці, зазначаў і Змітрок Бядуля.

Таму, разгледзеўшы ўважліва выявы, дадзім слова сучаснікам Максіма Багдановіча, якія ведалі яго асабіста (Адам Багдановіч, Дзіядор Дзябольскі, Ціхан Годнеў, Аляксандр Цітоў, Мікалай Агурцоў, Аляксей Залатароў, Яніна Каханоўская, Хведар Імшэнік, Васіль Гарбацэвіч, Ганна Валасовіч-Гразонава, Змітрок Бядуля, Людвіка Сівіцкая, Леанард (Лявон) Заяц, Аркадзь Смоліч, Паўліна Мядзёлка, Апалонія Савёнак, Зыгмунт Абрамовіч, а таксама звесткі ад сучаснікаў паэта ў пераказе Івана Замоціна і Рыгора Жалязняка)[1].

Прапаноўваю вашай увазе звесткі, якія не супярэчылі адна адной (у рэдкіх выпадках падаюцца варыянты) і дазваляюць у больш-менш поўнай форме скласці «аб'ёмны» партрэт пісьменніка ад старшых класаў гімназіі (1909) да яго смерці (1917) з характарыстыкай манеры паводзін і псіхалагічных асаблівасцей.



*Максім Багдановіч, 1911 г.*

Згодна з апісаннямі сучаснікаў, Максім Багдановіч быў высокі (каля 190 сантыметраў?), худы, з тонкай шыяй і запалымі грудзямі, трохі прыгорблена-сутулаваты, што імкнуўся неяк прыхаваць на людзях. Меў суразмерныя часткі цела і далікатныя прыгожыя рукі.

Рысы твару былі правільныя, з высокім ілбом і «капой» густых хвалістых непаслухмяных цёмна-каштанавых (русых?) валасоў, якія альбо зачэсваў назад, альбо зазвычай прыгладжваў рукой.

Скура была хваравіта бледная (васковая, пергаментная) з чырвоным румянцам у часы хвалявання.

Пад дрымучымі брывамі — глыбока пасаджаныя вочы нявызначанага колеру («блакітнага», «карыя», «шэрыя», «светлыя бяздонныя»), але выразныя, з адметным бляскам і праніклівасцю ў позірку, калі здаецца, што глядзіць праз цябе альбо ўнутр цябе.

Прамы нос, губы — тонкая верхняя і трошкі таўсцейшая ніжняя, а над імі — доўгія «спушчаныя» рыжаватыя вусы. Часам Максім Багдановіч адпускаў рыжаватыя бакенбарды і рэдзенькую бараду (барада ў сям'і Багдановічаў расла слабавата). Вусы пачаў гадаваць адразу па з'яўленні «расліннасці» на твары, што добра заўважна на фотаздымку 1909 года.

Выгляд агулам меў някідкі — шэры, крыху старэйшы за свае гады.

Голас у паэта быў своеасаблівы: ці то нізкі тэнар, ці то высокі барытон, размаўляць любіў, але ў час абвастрэння хваробы прамаўляў мала і прыцішана, стваралася ўражанне, быццам яму не хапала паветра.

На важныя для сябе тэмы выказваўся красамоўна і ўсхвалявана, чым умеў зачараваць сваіх слухачоў. Песні спяваў міма нот, але музыку любіў і добра ў ёй разбіраўся.

Карэктны і ветлівы, ён умеў іранізаваць, а ў сваёй кампаніі жартаваў. Шмат хто апісвае Багдановіча панурым і сур'ёзным, засяроджаным чалавекам, які па-сапраўднаму раскрываўся толькі ў сваім атачэнні. «Сярод блізка знаёмых людзей сарамлівасць яго знікала, але сярод незнаёмых ён рабіўся вельмі сарамлівым. З-за гэтага ён ніколі не бываў на вечарах у гімназіі», — адзначыў Дзіядор Дзябольскі.

Пачуццё гумару Максіма Багдановіча варта адзначыць асобна, як на ўзроўні гульні слоў, так і палёту фантазіі: умеў цягам расповеду маляваць камічныя карціны.

Вусная беларуская мова ў Максіма была слабая, і, гаворачы, збіваўся на русізмы, але ўлаўліваў дысанансы, спыняўся і перапытваў: «Як трэба сказаць гэта правільна?», «прашу, папраўце мяне», пра што згадваў Вацлаў Ластоўскі. Падобныя сведчанні ёсць і ў Хведара Імшэніка: «Мова М.Б. была чудная; відно было, што ён вывучае яе тэарэтычна і іншае слова праізносіў так, як яно пісалася. Калі француз пачуў бы, напрыклад, імя "*Paul*", так як яно пішацца, яму гэта было б чудно і мала зразумела, так і я дзівіўся выразам М.Б. і цяпер успамінаю, што яму зусім не даваліся падвойныя літары "дз", "дж". Слова "адраджэнне" вельмі чудно праізносіў М.Б. Але нягледзячы на гэта, М.Б. не траціў інтарэсу да беларускае мовы і прасіў мяне па некалькі разоў паўтараць трудныя для яго словы і выразы. Ён моцна ўслухоўваўся ў самую гучнасць слова, стараючыся спазнаць яго марфалогію». Гэтыя згадкі датычацца 1911—1912 гадоў.

На вопратку звяртаў увагі мала і апранаўся без прэтэнзіі на моду. Мог выклікаць нават ухмылку здзіўлення пры першым з'яўленні. Хадзіў пераважна ў форменнай, спачатку гімназічнай, а потым ліцэйскай адзежы. У старэйшых класах гімназіі касцюм Максіма «сваёй работы» вылучаўся небездакорным выглядам і танным матэрыялам (накшталт мультану). Пазней хадзіў у цёмна-зялёнай (чорнай?) ліцэйскай тужурцы і касаваротцы, у халодную пару ў вечна расхрыстаным старым студэнцкім паліто («шынялі») ды фуражцы, апранаў доўгія чорныя споднi, боты самыя звычайныя з нізкай халяўкай. У Мінску на працу дадаткова апранаў манішку і белы каўнерык.

З кананічнага вобраза выбіваецца толькі крымская маляваная выява 1915 года, дзе Максім Адамавіч апрануты ў белую сарочку пры гальштуку, фуражку і лёгкую накідку з башлыкам.

У манерах яго адчувалася культура гарадскога жыхара.

Знаёмыя характарызуюць Багдановіча як сціплага, зычлівага чалавека, які пры жаданні хутка знаходзіў агульную мову з любым суразмоўцам, мог адшукаць у кожным нейкае зерне, кропкі судакранання, магчымасць праявіць свае найлепшыя рысы, чым выклікаў да сябе сімпатыю і павагу. Хутка прывыкаў да людзей, у якіх ён знаходзіў што-небудзь агульнае з сабою, — адносіўся да іх заўсёды з пашанай. Умеў у вельмі кароткі час стаць блізкім да людзей, зусім не падобных на яго. Адгэтуль жа, з яго абаяння, бяруць пачатак і некаторыя больш інтымныя знаёмствы і сувязі.

Быў незласлівы і мяккі, задуменны, з пяшчотным, амаль жаночым сэрцам.

Захапляўся вобразамі, прыгажосцю, формай, моцнымі пачуццямі і таму часам бурна праяўляў эмоцыі, хаатычна і напорыста. Раздражняўся лёгка, але хутка адыходзіў.

Любіў спрэчкі, з азартам размахваў рукамі і прыціскаў іх да грудзей, а калі не знаходзіў аргументаў, павышаў голас да крыклівасці. Больш за ўсё цікавіўся нацыянальнымі і літаратурнымі пытаннямі, славянскімі мовамі.

«Уцягнуты ў дыскусію, ён рабіўся надзіва цікавым суразмоўнікам, нейк увесь запальваўся і ярка, як "чыстай вады гуманіст", умеў выказваць свае думкі», — адзначаў Зыгмунт Абрамовіч.

Валодаў энцыклапедычнымі ведамі ў розных галінах, умеў абгрунтавана разважаць пра грамадскія і літаратурныя з'явы, выдатна ведаў рускую і еўрапейскую паэзію, хараша (кожны раз па-рознаму) дэкламаваў вершы, якія запамінаў з двух-трох прачытанняў. Не было больш-менш значнага паэтычнага твора, які б ён не ведаў на памяць. Выдатна гуляў у шахматы[2].

Яшчэ з гімназічнай пары хвароба ўвесь час нагадвала пра сябе.

Да сухотаў ставіўся фатальна і за здароўем амаль не сачыў, за прыёмам лекаў часта глядзелі знаёмыя і сваякі, бо сам ён на іх забываўся. У перыяды абвастрэння ў Багдановіча пачынаўся кашаль («канфузліва пакашліваў, стараючыся не звярнуць нічыёй увагі», «калі кашляў, стараўся адысці ад людзей убок»), выступаў пот («пот выціраў бялюткімі насовачкамі») ды ішла горлам кроў, дыханне станавілася кароткім і хрыплым. Часта павышалася і доўга трымалася высокая тэмпература (за 38 градусаў). Выглядаў тады быццам пасля цяжкай працы. У такія моманты дактары раілі яму берагчы сілы — меней прамаўляць і болей спаць, але лекараў, па назіранні сяброў, Багдановіч не слухаўся, спаць клаўся позна. А часам самахоць уводзіў у свой рацыён абмежаванні (пасты), чым выклікаў поўнае непаразуменне тарышаў.

«Бачыце, кажа, вельмі перажываю тое, што я бяссільны памагчы тым, хто цяпер, падчас вайны, церпіць голад, асабліва шкадую дзяцей. Калі я сабе адмаўляю таго, што люблю (бо, прызнацца, люблю салодкую гарбату), мне здаецца, што я раблю нейкую ахвяру, і гэта мяне хоць крыху пацяшае...» — згадвае Людвіка Сівіцкая.

Стараўся трымацца вясёлым і бадзёрым, каб не выклікаць да сябе жалю і не палохаць нікога сваёй хваробай, што выглядала досыць натужна. Пра свой стан гаварыць не любіў, на спробы ўшчуванняў рабіўся непрыемна халодным і так рэзка адказваў, што далей на гэтую тэму не было ніякае ахвоты гутарыць.

Захаваліся неатрэбутаваныя ўспаміны, у якіх Максім Багдановіч так характарызаваў свае адносіны да сухотаў: «Я ўжо пагадзіўся са сваёй хваробай і з тым, што жыць засталося не шмат, але вельмі мне цяжка, што не магу мець сям'і. Я так люблю дзяцей». Па сведчаннях блізкіх, гэтая ідэя ледзь не цалкам займала думкі Максіма напрыканцы жыцця. Пры гэтым рабіў роспачныя агаворкі: «От што я, бадзяга, няпэўны чалавек, хіба мне можна быць бацькам і мужам».

Увогуле, не толькі да здароўя, але і да ўсіх спраў, якія датычыліся яго, ставіўся абыякава.

«У звычайным быту, — піша З. Бядуля, — ён быў бездапаможны, як дзіцё. Хоць зарабляў ён някепска, але харчаваўся вельмі скромна і насіў патрапаны студэнцкі касцюм. На ўсё гэта ў яго быў адзін адказ: "Мільёны людзей пакутуюць на франтах, і я не магу сабе дазволіць добра есці і добра апранацца". Грошы свае ён ціхачом аддаваў галадаючым бежанцам. Сам жыў як сярэдняяковы аскет».

Максім Багдановіч, сапраўды, часта дапамагаў іншым, займаўся дабрачыннасцю, «направа і налева» пазычаў грошы, меў выключную чуласць на чужую крыўду і ў вачах іншых выглядаў ідэалістам-фанатыкам.

Зразумела, што ўспаміны — справа няпэўная, і прыведзеныя вышэй апісанні могуць як удакладніць пэўныя моманты, так і ўвесці ў зман. Але за адсутнасцю іншай інфармацыі (дакументаў, успамінаў, малюнкаў, фотаздымкаў і г. д.) іх варта прыняць да ведама, каб лепш уявіць таго, хто падарыў нам сваю выдатную творчасць.

**Міхаіл БАРАНОЎСКІ**

[1] Для гэтага аўтар сістэматызаваў усе даступныя згадкі па дадзенай тэме з указаннем аўтарства і крыніцы, а таксама часу, да якога адносяцца ўспаміны. Поўны матэрыял будзе прадстаўлены на найбліжэйшай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай Максіму Багдановічу.

[2] Інфармацыя пра стаўленне да творчасці, гульняў і грамадска-філасофскія погляды разглядаецца ў іншых артыкулах аўтара.